---

*Аляксандр Карацееў*

## АСНОЎНЫЯ ПРАБЛЕМЫ І ПАРАМЕТРЫ АРГАНІЗАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЙ, ТВОРЧА-ВЫКАНАЛЬНІЦКАЙ ДЗЕЙНАСЦІ КІРАЎНІКОЎ ФАЛЬКЛОРНАГА КАЛЕКТЫВУ З ТРАДЫЦЫЙНЫМІ НАРОДНЫМІ ДУХАВЫМІ І УДАРНЫМІ ІНСТРУМЕНТАМІ БЕЛАРУСАЎ (*па матэрыялах функцыянавання мастацкіх вучэбных, аматарскіх і прафесійных калектываў*)

*У артыкуле разглядаюцца праблемы, якія тычацца вызначэння асноўных параметраў арганізацыйна-метадычнай, творча-выканальніцкай дзейнасці кіраўнікоў фальклорнага калектыву з удзелам традыцыйных народных духавых і ударных інструментаў беларусаў. Матэрыялы даследавання грунтуюцца на вывучэнні пытання функцыянавання мастацкіх вучэбных, аматарскіх і прафесійных калектываў, якія ўключаюць гэтыя музычныя інструменты.*

*Alyaksandr Karatseieu*

## KEY ISSUES AND OPTIONS OF ORGANIZATIONAL AND METHODOLOGICAL, CREATIVE AND PERFORMING ACTIVITIES BY THE HEADS OF FOLKLORE GROUPS WITH THE TRADITIONAL FOLK WIND AND PERCUSSION INSTRUMENTS OF THE BELARUSIANS (based on the functioning of artistic education, amateur and professional collectives)

*The article deals with the problems concerning the definition of the basic parameters of the organizational-methodological, creative and performing activity by the leaders of folk ensemble with traditional folk wind and percussion instruments of the Belarusians. Materials of the research are based on studying the issue of the functioning of artistic education, amateur and professional collectives, including these musical instruments.*

У музычнай культуры Беларусі традыцыйныя народныя духавыя і ўдарныя музычныя інструменты беларусаў з кожным годам карыстаюцца заслужанай папулярнасцю ў слухачоў і становяцца актуальным аб'ектам даследаванняў музыказнаўцаў, выканаўцаў, гісторыкаў, выкладчыкаў, спецыялістаў сацыякультурнай дзейнасці і г.д. Вядома, што народны музычны інструментарый ў розных краінах з'яўляецца яскравым паказальнікам дасягненняў матэрыяльнаq, а таксама і духоўнай нацыянальнай спадчыны краіны, значнай часткай нацыянальнага музычнага мастацтва і аматарскай творчасці дзяржавы [18; 19].

Адзначым, што да даследавання арганалагічных і функцыянальных асаблівасцей гэтых унікальных прадстаўнікоў народнага музычнага інструментарыя, напрыклад на Беларусі, у прыватнасці – духавых і ўдарных інструментаў, звярнуўся як шэраг беларускіх спецыялістаў музычнага мастацтва [14; 12, с. 21-26; 15], так і польскія даследчыкі – К.Машынскі [22] і Ч.Пяткевіч [23]. Іншыя спецыялісты музычнага мастацтва Беларусі разгледзелі тую ролю, якая тычыцца выканальніцтва на гэтых інструментах ў структуры нацыянальнай мастацкай культуры Беларусі [3, с. 168-176; 5, с. 200-205; 6, с.180-184; 8, с.135-137; 9, с.87-94; 10, с. 66-72].

Адна з галоўных праблем гэтага кірунку на сённяшні дзень – гэта не толькі папулярызацыя звестак і значнасці аб унікальных прадстаўніках традыцыйнага народнага духавога музычнага інструментарыя беларусаў, але і праблемы навучання і падрыхтоўкі выканаўцаў на гэтых інструментах [1; 2; 4, с.138-146; 7, с. 127-130; 12, с. 21-26; 16, с. 237-239].

У сваіх даследаваннях мы звярнуліся да праблемы вызначэння тых арганізацыйна-метадычных і творча-выканальніцкіх параметраў, якія закліканы адыграць істотную ролю ў прафесійнай дзейнасці кіраўніка інструментальнага фальклорнага коллетива, у прыватнасці – з уключэннем у такія калектывы традыцыйнага народнага духавога і ўдарнага музычнага інструментарыя беларусаў.

Сама праблема функцыянавання і значнасці фальклорнага калектыва, асабліва яга дзіцячых саставаў, вельмі актуальная на сёняшні дзень [20; 21]. «…адной з актуальных праблем з'яўляецца фарміраванне інтарэсу да нацыянальнага фальклору, – падкрэслівае даследчык народна-інструментальнай спадчыны Беларусі В.Трамбіцкая. – Спецыялісты адзначаюць, што выхаванне дзяцей на мове нацыянальнага меласу здольна захаваць і развіць традыцыі народнай культуры, выхаваць у дзяцей высокія пачуцці грамадзянскасці, маральнасці, этычнасці, сфарміраваць добры мастацкі густ. Аднак, не гледзячы на наўнасць у сучаснай музычнай педагогіцы тэарэтычных і эксперыментальных работ па фарміраванню у дзяцей цікавасці да фальклору (Б.Асаф'еў, Л.Баленка, А.Балгарскі, Л.Баравікоў, В.Дышлеўская, С.Кулієў), некаторыя аспекты праблемы і сёння не знайшлі належнай распрацоўкі. Недастаткова вывучаны, напрыклад, магчымасці этнапедагогікі па фарміраванні інтарэсу да фальклору, неакрэслены перспектывы рэалізацыі сінкрэтызма



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

фальклора ў педагагічным працэсе дзіцячага музычнага калектыву. Адсутнічаючь методыкі фарміравання цікавасці да фальклора ў дзяцей з розным узроўнем здольнасцей і інтарэсаў» [20, с. 43-44]. Яскравым прыкладам неабходнасці вырашэнняў праблем у гэтыім адказным кірунку з'явілася, дзякуюцы намаганням апантаннага энтузіяста па вывучэнню, успрыманню, захаванню і папулярызацыі нацыянальнага фальклору беларусаў прафесара І.І.Сучкова, правядзенне навуковай канферэнцыі «Этнашкола» ў сучасным адукацыйным працэсе: вопыт станаўлення і перспектывы развіцця (да 10-годдзя існавання этнашколы, якую арганізавал гэты спецыяліст. Адну з праблем па вызначэнню ролі фальклорных музычных духавых інструментаў белорусов у этнакультурным выхаванні і мастацкай адукацыі дзяцей і моладзі раглядалі і мы ў асабістым навуковым дакладзе, матэрыялы якога адлюстраваны у нашым артыкуле [9, с. 87-94].

Безумоўна, уся адказнасць за вырашэнне праблемы захавання, вывучэння, успрымання інструментальнага фальклору, які, асабліва датычыцца да традыцыйнага народнага духавога і ўдарнага музычнага інструментарыя беларусаў, в ляжыць на тых спецыялістах, якія займаюцца практычнай асветнай і творчай дзейнасцью. І, ў першую чаргу, гэта дакранаецца саміх кіраўнікоў фальклорных мастацкіх калектываў. Але вынікі плённай працы і значныя дасягненні тут ёсць. Дзякуючы магчымасці адкрыцця ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў у 2000-2001 навучальным годзе падрыхтоўку кадраў вышэйшай кваліфікацыі напрамку спецыяльнасці 1-16 01 06 11 "Духавыя інструменты (народныя)" і выпуску кваліфікаваных спецыялістаў, у рэспубліцы з'явіліся ўнікальныя дзіцячыя калектывы, у складзе якіх – традыцыйныя народныя духавыя і ўдарныя музычныя інструменты беларусаў.

Так, сур'ёзную працу па прылучэнні дзяцей да фальклорнай спадчыны ажыццяўляе ансамбль «Лебедзеўскія выкрутасы» пад кіраўніцтвам выпускніка кафедры духавой музыкі 2009 года магістра мастацтвазнаўства, лаўрэата і уладальніка прэстыжных Гран-пры шматлікіх рэспубліканскіх і міжнародных конкурсаў, С.Ярука. Калектыў дзяцей пад яго кіраўніцтвам здолеў дамагчыся прызнання ў аматараў нацыянальнага інструментальнага фальклору, а за паспяховыя выступы ў конкурсных спаборніцтвах і іншых мерапрыемствах быў адзначаны многімі дыпломамі.

Але, каб атрымаць гэтыя перамогі, кіраўнік павінен быў вырашыць шэраг пытанняў і праблем. «Трэба адзначыць, – падкрэслівае ў сваім інтэрв'ю апантаны фальклорнай спадчынай беларусаў Сяргей Ярук, – што у беларускай дудкі ёсць перспектыва ў дзіцячых школах мастацтваў, як спецыяльны інструмент. Дакладна ведаю, што некаторыя настаўнікі па класе духавых інструментаў аддаюць перавагу, менавіта, беларускай дудцы, а не блок-флейце. Тая ж дудка па сваіх характарыстыках – інструмент тэхнічны, які дазваляе ўсебакова развіваць музычныя здольнасці ў вучняў. Але праблемы па самому інструментарыю да гэтай пары не вырашаны, як не пабудавана па вертыкалі сістэма адукацыі па навучанню на гэтых інструментах (пачынаючы з школы і заканчываючы ВНУ), што адмоўна сказваецца на тым жа станаўленні выканальніцкай школы на беларускіх народных духавых інструментах, на прафесійны ўзровень выканаўцаў на інструменце, таксаманазіраюцца праблемы і з рэпертуарам, зыходзячы з пералічанага вышэй».

Значную творча-выканальніцкую дзейнасць па папулярызацыі выканаўства на традыцыйных народных духавых і ўдарных музычных інструментах беларусаў ажыццяўляе і Ансамбль беларускіх дудак «Чароўныя гукі» пад кіраўніцтвам выпускніка кафедры духавой музыкі 2009 года Р.Нусова. Пра яго педагагічныя, асветніцкія поспехі таксама красамоўна кажуць вынікі конкурсных выступаў яго выхаванцаў.

Паспяховай асветніцкай і творчай дзейнасцю займаецца і ансамбль народных духавых інструментаў ДУА «Палац дзяцей імоладзі «Золак» г. Мінска» пад кіраўніцтвам выпускніка 2016 года А.Анціпенкі. Нягледзячы на тое, што ён пасля сканчэння ВНУ приступіў да стварэння калектыву толькі з верасня 2016 года, дзеці пад яго кіраўніцтвам змаглі не толькі асвоіць і пакахаць традыцыйныя беларускія народныя інструменты, але і дамагчыся сур'ёзных творчых вынікаў іпераканаўчых перамог. Калектыў стаў Лаўрэятам I ступені конкурсу «Калядная зорка» (16.01.2016), Дыпламантам фінальнага тура II міжнароднага фэсту-конкурсу «Новыя вяршыні» (10.04.2016), якія арганізавалі і паспяхова правялі спецыялісты ДУА «Палац дзяцей і моладзі "Золак" г. Мінска».

Паспяхова папулярызуюць інструментальны фальклор Беларусі і такія маладыя дзіцячыя мастацкія калектывы, як ансамбль дудак ДУА «Дзіцячая музычна-мастацкая школа мастацтваў № 1 г. Мінска» пад кіраўніцтвам Дрнаян Карыны Эмільеўны, выканальніцкае майстэрства якога было адзначана дыпломам Лаўрэята II-ой ступені III-га адкрытага Рэспубліканскага конкурсу музычнага мастацтва Беларусі «***Спадчына***» 2015 года, а таксама ансамбль старадаўняй музыкі «***Рарог***» ДУА «Івянецкая дзіцячая школа мастацтваў» пад кіраўніцтвам Радзівілавай Кацярыны Пятроўны, які атрымаў дыплом Лаўрэята I-ай ступені III-га адкрытага Рэспубліканскага конкурсу музычнага мастацтва Беларусі «***Спадчына***» 2015 года. Поспехаў дасягнулі і апантаныя ўдзельнікі ансамбляў акарын ДУА «Дзіцячая музычная школа мастацтваў № 19 г. Мінска» пад кіраўніцтвам Анастасіі Аляксандраўны Думанскай, Інесы Сяргееўны Шчукі – таленавітых выхаванцаў кафедры духавой музыкі УА «БДУКМ», уладальнікаў дыпломаў лаўрэтаў шматлікіх рэспубліканскіх і міжнародных конкурсаў, у тым ліку – і прэстыжных дыпломаў «Grand Prix».

Плённа займаюцца творча-выканальніцкай дзейнасцю і такія фальклорныя калектывы з удзелам традыцыйных народных духавых інструментаў беларусаў, як Ансамбль «***Festivo***» у складзе з драўлянымі старажытнымі пастуховымі трубамі пад кіраўніцтвам А.Карацеева ў Беларускай асацыяцыі духавых аркестраў і ансамбляў (*БАДОА/BASBE*) Беларускага саюзу музычных дзеячоў, ансамбль дудак, жалеек, акарын пад кіраўніцтвам заслужанага артыста Рэспублікі Беларусь А.Крамко у Нацыянальным акадэмічным аркестры



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

народных інструментаў імя І.Жыновіча, уладальнік шматлікіх дыпломаў лаўрэатаў рэспубліканскіх і міжнародных конкурсаў і фестываляў ансамбль беларускіх народных духавых інструментаў «Дудачка» і квінтэт дудак знакамітай капэлы беларускіх народных духавых інструментаў «Гуды» імя У.Грома пад кіраўніцтвам прафесара кафедры духавой музыкі УА «БДУКМ» І.Мангушава, маладзёжны ансамбль акарын «Сарокі» пад кіраўніцтвам А. Думанскай, які з'яўляецца лаўрэатамі розных рэгіянальных, рэспубліканскіх і міжнародных конкурсаў і фестываляў, у тым ліку – у Расіі, Польшчы і Італіі (2015 год) і іншыя.

Даследуя праблемы вызначэння тых арганізацыйна-метадычных і творча-выканальніцкіх параметраў, якія закліканы адыграць істотную ролю ў прафесійнай дзейнасці кіраўніка інструментальнага фальклорнага коллектива, трэба звярнуцца да працэсу парыхтоўкі кадраў на кафедры духавой музыкі БДУКМ (на жаль, на 2016-2017 навучальны год, на прыклад, па напрамку спецыяльнасці 1-16 01 06 11 «Духавыя інструменты (народныя)» набор студэнтаў быў увогуле скасаваны!). У асабістым артыкуле мы ужо адзначалі, што народна-ансамблевае выканальніцтва – гэта неабходная умова якаснай падрыхтоўкі кадраў вышэйшай кваліфікацыі, якія здольны не толькі засвоіць тыя ці іншыя традыцыйныя народныя духавыя і ўдарныя музычныя інструменты беларусаў і выконваць віртуозныя творы, але і валодаць майстэрствам сумеснага выканальніцтва і падрыхтаваць аналагічных выканаўцаў [8, с. 135-137]. Менавіта па гэтых прычынах намі была распрацавана адпаведная вучэбная праграма па спецыяльнасці 1-16 01 06 «Духавыя інструменты (па напрамках)» напрамку спецыяльнасці 1-16 01 06 – 11 «Духавыя інструменты (народныя)» «Методыка работы з фальклорным калектывам» [11]. Гэтая вучэбная дысцыпліна павінна стаць адной з асноўных дысцыплін у працэсе падрыхтоўкі выканаўцаў на народных духавых інструментах. Мэта дысцыпліны «Методыка работы з фальклорным калектывам» – гэта падрыхтоўка высокакваліфікаваных спецыялістаў вышэйшай адукацыі, якія здольны ажыцяўляць творча-выканальніцкую дзейнасць як саліст-выканаўца, артыст ці кіраўнік тага ці іншага састава аркестра, капэлы ці ансамбля, з якім яны будуць самастойна працаваць.

Распрацаваны матэрыял праграмы дазваляе падчас практычных заняткаў набываць студэнтам практыку работы з фальклорным калектывам у выглядзе ансамбля, капэлы ці аркестра народных інструментаў, а таксама рэалізаваць асабістыя мастацкія навыкі ў якасці саліста-інструменталіста. У працэсе распрацоўкі гэтай праграмы неабходно было вызначыць аптымальныя пытанні па развіццю навыкаў, уменняў і ведаў у студэнтаў (*гл. дадатакі № 1, 2*). Так, напрыклад, дзякуючы арганізацыі навучальнага працэсу адпаведна распрацаванай праграме, будучыя кіріаўнікі фалькорных калектываў маюць магчымасць развіць наступныя навыкі:

– падбіранне партытур для розных саставаў ансамбляў, аркестраў духавых і ударных інструментаў з мэтай эфектыйнай арганізацыі рэпетыцыйных заняткаў з іх удзельнікамі;

– дакладнага афармлення зместу розных планаў работы з калектывамі (ансамбль, капэла, аркестр);

– дакладных ведаў сутнасці розных тыпаў агульна-калектыўных
рэпетыцый з фальклорнымі калектывамі (ансамбль, капэла, аркестр);

– аптымальнае вызначэнне партытур для розных саставаў ансамбляў, капэл, аркестраў народных інструментаў у адпаведнасці з існуючымі патрабаваннямі арганізацыі сацыякультурнай, музычна-асветніцкай і музычна-эстэтычнай дзейнасцю мастацкага калектыва (ансамбль, капэла, аркестр);

– расшыфроўкі існуючай спецыяльнай тэрміналогіі па методыкі работы з з фальклорным калектывам (ансамбль, капэла, аркестр).

Падчас вывучэння курса студэнты павінны засвоіць наступныя уменні:

– напісанне розных варыянтаў плана работы з вызначэнным саставам фальклорных калектываў (ансамбль, капэла, аркестр);

– вызначэнне розных тыпаў рэпетыцыйных заняткаў для розных саставаў фальклорных калектываў (ансамбль, капэла, аркестр);

ансамбля аркестравых груп у межах фальклорнага калектыва (ансамбль, капэла, аркестр)аркестравага калектыву;

– вырашэнне пытанняў па выкананні аркестравых (ансамлевых) цяжкасцей для ўдзельнікаў той ці іншай інструментальнай групы і магчымай адаптацыі адпаведнага музычнага матэрыяла;

– аналітычная работа падчас вызначэння партытур для падрыхтоўкі музычных твораў;

– практычная работа падчас вызначэння партытур і правядзення рэпетыцыйных заняткаў з удзельнікамі фальклорных калектываў (ансамбль, капэла, аркестр) з мэтай вызначэння асабных фрагментаў меладычнага галасавядзення, кантрапункту, умова адпаведнага транспаніровання і неабходнай змены тэсітуры гучання музычнага твору, улік жанрава-стылявых асаблівасцей пры выкананні ансамблям, капэлай ці аркестрам , якія ўключаюць народныя духавыя і ударныя інструменты.

Падчас вывучэння вучэбнай дысцыпліны «Методыка работы з фальклорным калектывам» студэнты маюць магчымасць засвоіць веды па шырокаму колу пытанняў:

– класіфікацыя, функцыянальныя і мастацка-выканальніцкія асаблівасці тыповых саставаў фальклорных калектываў (ансамбль, капэла, аркестр);

– сутнасць аркестрава-ансамблевага выканаўства і вызначэнне адпаведных задач пры выкананні музычных твораў;

– мастацка-творчыя, арганізацыйна-метадычныя асаблівасці работы па напісанню партытур для фальклорных калектываў (ансамбль, капэла, аркестр);

– этапы работы над музычнымі творамі, іх змест і задачы;



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– выкананне розных тэматычных груп музычных твораў падчас працэсу фарміравання рэпертуару для фальклорных калектываў (ансамбль, капэла, аркестр);

– функцыянальныя, мастацка-выразныя, тэхнічна-выканальніцкія магчымасці народных духавых і ударных інструментаў і спецыфіка іх выкарыстання ў фальклорных калектываў (ансамбль, капэла, аркестр);

– сутнасць аркестрава-ансамблевай падрыхтоўкі падчас арганізацыі агульна-аркестравай рэпетыцыі;

– сацыякультурныя аспекты, асаблівасці арганізацыі канцэртна-выканальніцкай дзейнасці фальклорных ансамбляў, капэл, аркестраў народных духавых і ударных інструментаў і выкарыстанне разнастайнасці мастацка-тэматычных груп музычных твораў з улікам сацыяльнай і узроставай катэгорыі слухачоў, на якіх разлічана канцэртная праграма.

Важным момантам з'яўляецца тое, што у матэрыялах праграмы прапануецца звярнуць ўвагу на спецыфіку традыцыйных народных духавых інструментаў беларусаў, якія маюць шэраг канструктыўных і тэхналагічных недахопаў. Гэта патрабуе звярнуць увагу на чысціню інтанавання на гэтіх інструментах, асабліва пры ігры на дудцы і акарыне, калі выканаўца павінен выкарыстоўваць дадатковую аплікатуру ў залежнасці ад меладычнай ці гарманічнай лініі ў творы. А на жалейцы інтанацыя і чысціня гучання будзе залежыць ад інтэнсіўнага пасылу і выдыху выканаўчага дыхання. На дудзе гэтыя пытанні будуць залежыць ад раўнамернага націску на мех. Праблему чысціню інтанавання дэталёва былі прааналізаваны і разгледжаны прафесарам І.Мангушавым [16, с. 237-239]. Усе пытанні, якія тычацца да праблемы дасягнення чысціні інтанавання на традыцыйных народных духавых інструментах беларусаў, павінны вырашацца ў навучальным працэсе, каб будучыя кіраўнікі фальклорных калектываў былі здольны арганізаваць адпаведную арганізацыйна-метадычную і творча-выканальніцкую работу па сумеснай дзенасці ўдзельнікаў сваіх мастацкіх калектываў. Складанае пытанне для будучых кіраўнікоў фальклорных калектываў – гэта вызначэнне параметраў менавыіта паліфункцыянальных службовых абавязкаў, якія павінен выконваць кіраўнік фальклорнага ансамбля, капэлы ці аркестра з уключэннем народных духавых і ударных інструментаў, таму што місія кіраўніка фальклорнага ансамбля, капэлы ці аркестра – вельмі адказная. Ён – арганізатар выхаваўчай і вучэбна-творчай работы мастацкага калектыва, адказны за фарміраванне асабістых якасцей асабы удзельнікаў свайго калектыву.

Таму высвятленне пытанняў аб асноўных праблемах і параметрах арганізацыйна-метадычнай, творча-выканальніцкай дзейнасці кіраўнікоў фальклорнага калектыва з традыцыйнымі народнымі духавымі і ударнымі інструментамі беларусаў – гэта неабходная умова плённай працы і фынкцыянавання гэтых калектываў не толькі як творчых адзінак, але і як сродак захавання нацыянальнай спадчыны і вырашэння мастацкіх задач на сацыякультурным узроўні.

***Дадатак № 1***

**ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН**

**па дысцыпліне "МЕТОДЫКА РАБОТЫ З ФАЛЬКЛОРНЫМ КАЛЕКТЫВАМ (ансамбль, капэла, аркестр)" для студэнтаў спецыяльнасці 1-16 01 06 «Духавыя інструменты (па напрамках)» напрамку спецыяльнасці 1-16 01 06 11 «Духавыя інструменты (народныя)»**

| № п/п | ***Н А З В А Т Э М Ы*** | **Колькасць аўдыторных гадзін** | | |
|---|---|---|---|---|
| | | лекц. | семін., практ. | Усяго |
| . | ***Уводзіны.*** | 2 | | **2** |
| | **Раздзел І.** ***Гісторыя развіцця фальклорных аркестраў, капэл, ансамбляў.*** | | | **16** |
| Тэма 1.. | Гісторыя развіцця ансамбляў, капэл і аркестраў духавых і ударных інструментаў (у кантэксце сусветнай музычнай культуры). | 4 | 1 | 5 |
| Тэма 2. | Сучасныя выканальніцкія формы творчай дзейнасці фальклорных калектываў, якія ўключаюць народныя духавыя і ударныя інструменты. | 8 | 3 | 11 |
| | **Раздзел ІІ.** ***Тэарэтычныя аспекты методыкі работы з фальклорныхмі ансамблямі, капэламі і аркестрамі, якія ўключаюць народныя духавыя і ударныя інструменты.*** | | | **23** |
| Тэма 3. | Кіраўнік фальклорнага ансамбля, капэлы, аркестра – арганізатар выхаваўчай і вучэбна-творчай работы мастацкага калектыва. (две лекциив2семестре!) | 10 | 1 | 11 |
| Тэма 4. | Асаблівасці інтанавання народных духавых інструментаў у складзе ансамбля, капэлы, аркестра | 4 | 1 | 5 |
| Тэма 5. | Сутнасць рэпетыцыйнай работы з інструментамі, якія транспануюць | 6 | 1 | 7 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | Раздзел III. ***Творча-практычныя аспекты методыкі работы з фальклорнымі ансамблямі, капэламі і аркестрамі, якія ўключаюць народныя духавыя і ударныя інструменты.*** | | | **37** |
| Тэма 6. | Сутнасць работы з групай народных лабіяльных інструментаў у працэсе рэпетыцыйнай работы з фальклорным ансамблям, капэлай, аркестрам | 4 | 1 | 5 |
| Тэма 7. | Сутнасць работы з групай народных язычковых інструментаў у працэсе рэпетыцыйнай работы з фальклорным ансамблям, капэлай, аркестрам | 2 | | 2 |
| Тэма 8. | Работа з фальклорным ансамблям, капэлай, якія ўключаюць народныя духавыя і ударныя інструменты | 8 | 1 | 9 |
| Тэма 9. | Правядзенне асноўных тыпаў рэпетыцый | 10 | 1 | 11 |
| Тэма 10. | Асноўныя віды канцэртна-выканальніцкай дзейнасці фальклорных ансамбляў, капэл, аркестраў і яе арганізацыя | 8 | 2 | 10 |
| | ***УСЯГО:*** | ***66*** | ***12*** | ***78*** |

*Дадатак № 2*

**КАНТРОЛЬНЫЯ ПЫТАННІ ДЛЯ САМААТЭСТАЦЫІ СТУДЭНТАЎ па дысцыпліне “МЕТОДЫКА РАБОТЫ З ФАЛЬКЛОРНЫМ КАЛЕКТЫВАМ (ансамбль, капэла, аркестр)” для студэнтаў спецыяльнасці 1-16 01 06 «Духавыя інструменты (па напрамках)» напрамку спецыяльнасці 1-16 01 06 11 «Духавыя інструменты (народныя)»**

1. Неабходнасць мастацка-выканаўчай падрыхтоўкі кіраўніка фальклорнага аматарскага і прафесійнага калектыва.
2. Арганізацыйныя пытанні па стварэнні фальклорных аматарскіх і прафесійных калектываў.
3. Узроўні фарміравання асобы удзельнікаў фальклорнага аматарскага калектыва.
4. Асноўныя тыпы рэпетыцыйных заняткаў фальклорнага аматарскага і прафесійнага калектыва.
5. Сутнасць педагагічнай падрыхтоўкі кіраўніка фальклорнага аматарскага калектыва.
6. Разнастайнасці планаў работы фальклорных калектываў.
7. Службовыя абавязкі кіраўніка фальклорнага калектыва (прафесійны калектыў). Паліфункцыянальная накіраванасць дзейнасці кіраўніка аматарскага фальклорнага калектыва.
8. Асаблівасці работы над вучэбным рэпертуарам.
9. Формы музычна-асветніцкай работы і музычна-эстэтычнага выхавання удзельнікаў фальклорнага калектыва.
10. Спецыфіка падрыхтоўкі канцэртнага рэпертуару.
11. Асноўныя ідэйна-мастацкія і дыдактычныя прынцыпы падбору рэпертуара і яго педагагічная накіраванасць у фальклорным аматарскім і прафесійным калектыве.
12. Асноўныя прынцыпы правядзення заняткаў у фальклорным аматарскім і прафесійным калектыве.
13. Віды мастацкага рэпертуара і шляхі яго фарміравання ў фальклорным аматарскам і прафесійным калектыве.
14. Сістэма і асаблівасці арганізацыі індывідуальных заняткаў з удзельнікамі аматарскага фальклорнага калектыва.
15. Сістэма і асаблівасці арганізацыі дробнагрупавых і групавых рэпетыцыйных заняткаў з удзельнікамі аматарскіх і прафесійных фальклорных калектываў (ансамбль, капэла, аркестр).
16. Сістэма і асаблівасці арганізацыі агульна-калектыўных рэпетыцыйных заняткаў з удзельнікамі фальклорных аматарскіх і прафесійных калектываў (ансамбль, капэла, аркестр).
17. . Праблема фарміравання рэпертуару фальклорных аматарскіх калектываў.
18. Сістэматызацыя музычных твораў па тэматычных групах пры фарміраванні мастацкага рэпертуара у фальклорным калектыве (прафесійным калектыве).
19. Сістэма арганізацыі заняткаў з удзельнікамі ансамбляў розных форм і і х падрыхтоўка да канцэртна-выканальніцкай дзейнасці.
20. Сутнасць канцэрна-выканаўчай дзейнасці фальклорнага калектыва (прафесійны, аматарскі).
21. Структура вучэбна-выхаваўчага і творчага працэсу ў фальклорным аматарскім калектыве.
22. Сутнасць, арганізацыя ансамбляў малай формы ў фальклорным аматарскім і прафесійным калектыве.
23. Творчыя дасягненні вядучых фальклорных калектываў Беларусі з выканаўцамі на беларускіх традыцыйных народных духавых інструментах (саставы, рэпертуар, формы дзейнасці).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Спіс літаратуры:**


1. Гром, У.М, Крамко А.Я., Мангушаў І.А. Школа ігры на беларускіх народных духавых інструментах. Ч. 1. Сольнае выкананне: Вучэб.-метад. дапам. – Мн.: Бел. дзяр. ун-т культуры і мастацтваў, 2005. – 259 с.
2. Гром, У.М., Крамко А.Я., Мангушаў І.А. Школа ігры на беларускіх народных духавых інструментах. Ч. 2. Ансамблевае выкананне: Вучэб.-метад. дапам. – Мн.: Бел. дзяр. ун-т культуры і мастацтваў, 2005. – 217 с.
3. Коротеев, А.Л. Бытование амбушюрных духовых музыкальных инструментов в Беларуси (по материалам археологических изысканий, архивных исследований и анализа печатных изданий в контексте славянской органологии) / А.Л. Коротеев // IV Міжнародная Кірыла-Мяфодзіееўскія чытанні, прысвечанныя Дням славянскага пісьменства і культуры: Матэрыялы чытанняў (Мінск, 24-26 мая 1998 г.). У 2 ч. Ч. 2 / ЕГУ, БУК; Рэдкал.:Пазнякоў А.У. (адк. ред.) і інш. – Минск: Бел. ун-т культуры, 1999. – 168-176.
4. Коротеев, А.Л. Генезис образования специалистов духового исполнительского искусства Беларуси (народно-инструментального, профессионального и любительского) / А.Л. Коротеев // Музыкальное искусство и музыкальное образование на рубеже веков: Материалы научных конференций "Беларусь и музыкальное наследие XX столетия: поиски и обретения» (29-30 ноября 2001 г., Минск), «Музыкальное образование в контексте художественной культуры» (10-11 декабря 2002 г., Минск). – Вып. 1. – Минск: Белорусская государственная академия музыки, 2004. – С. 138-146.
5. Коротеев, А.Л. Исполнительство на традиционных народных духовых инструментах как структурный компонент национальной художественной культуры (в контексте искусствоведческого исследования духового искусства Беларуси) / А.Л. Коротеев // Культура. Наука.Творчество. VI-я Междунар. науч.-практ. конф. / Минск, 10-11 мая 2012 г.: сб.науч. ст. / Мин-во культуры Республики Беларусь; гос. ун-т культ. и искусств; науч. ред. М.А.Можейко. – Минск: БГУКИ, 2012. – С. 200 – 205.
6. Коротеев, А.Л. Инструменты группы мундштучных этноаэрофонов в фольклорной традиции и современной сценической практике Беларуси / А.Л.Коротеев // Аўтэнтычны фальклор: праблемы вывучэння, захавання, пераймання. Зб. навуковых прац удзельнікаў VIII міжнар. навук. конф. (Мінск,25 – 27 красавіка 2014 г.) / БДУКМ, рэдкал.: Языковіч В.Р. (адк. рэд.) [і інш].. – Мінск: БДУКМ,. 2014. – С.180-184.
7. Карацееў, А.Л. Народныя духавыя інструменты беларусаў: да праблемы падрыхтоўкі прафесійных кадраў вышэйшай кваліфікацыі (ў кантэксце духавога мастацтва Беларусі і музычнай педагогікі) / А.Л. Карацееў // Аўтэнтычны фальклор: праблемы захавання, вывучэння, успрымання: зборнік навуковых прац удзельнікаў VI Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі (Мінск, 27 – 29 красавіка2012 г.) / БДУКМ; рэдкал.: Мажэйка М.А. (адк. рэд. [і інш.]. – Мінск: БДУКМ, 2012. – С. 127 – 130.
8. Карацееў, А.Л. Народна-ансамблевае выканальніцтва як умова якаснай падрыхтоўкі кадраў вышэйшай кваліфікацыі (напрамак спецыяльнасці 1-16 01 06 11 «Духавыя інструменты (народныя)») / А.Л.Карацееў // Аўтэнтычны фальклор: праблемы захавання, вывучэння, успрымання: зборнік навуковых прац удзельнікаў VII Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі (Мінск, 26– 28 красавіка 2013 г.) / БДУКМ; рэдкал.: Языковіч В.Р. (адк. рэд. [і інш.]. – Мінск: БДУКМ, 2013. – С. 135 – 137.
9. Коротеев, А.Л Фольклорные духовые инструменты белорусов в этнокультурном воспитании и художественном образовании детей и молодёжи (от музыкальной игрушки до разнообразия национального инструментария) / А.Л. Коротеев // "Этнашкола» ў сучасным адукацыйным працэсе: вопыт станаўлення і перспектывы развіцця (да 10-годдзя існавання) / Уклад. і навук. рэдакт. праф. І.І.Сучкоў. – Мн.: Бестпринт, 2004. – С. 87-94.
10. Коротеев. А.Л. Функциональные и этноорганологические особенности белорусских народных духовых инструментов / А.Л. Коротеев // X Міжнародныя Кірыла-Мяфодзіеўскія чытанні, прысвечаныя Дням славянскага пісьменства і культуры (Мінск, 24-26 мая 2004 г.) / Рэдкал.: М.А.Бяспалая (адк. Рэд.) і інш. – Мн.: Бел. дзярж. Ун-т культуры і мастацтваў, 2005. – С. 66-72.
11. Карацееў, А.Л. Методыка работы з фальклорным калектывам: вучэбная праграма па спецыяльнасці 1-16 01 06 «Духавыя інструменты (па напрамках)» напрамку спецыяльнасці 1-16 01 06 – 11 «Духавыя інструменты (народныя)» / А.Л.Карацееў . – Мінск: БДУКМ, 2013. –21 с.
12. Карацееў, А.Л. Народны духавы музычны інструментарый Беларусі як гістарычная сведка развіцця нацыянальнай культуры і яго месца ў сусветнай арганалогіі і арганафоніі // Зборнік тэзісаў дакладаў на навукова-метадычнай канферэнцыі прафесарска- выкладчыцкага складу, ч. 1. - Мінск: МІК. 1993. - С. 21-26.
13. Карацееў, А.Л. Неардынарная з'ява нацыянальна-выканальніцкага адраджэння // Веснік БДУ культуры і мастацтваў. 2005, № 5. – С. 119-122.
14. Крамко, А.Я. Беларускія народныя духавыя інструменты: вучэб. дапам. / А.Я. Крамко – Мн.: Бел. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2005. – 34 с.
15. Назіна, І.Д. Беларускія народныя музычныя інструменты / І.Д.Назіна. – Мн.: Беларусь, 1997. -239 с.
16. Мангушев, И.А. К вопросу об интонировании на народных духовых инструментах / И.А.Мангушев // Аўтэнтычны фальклор: праблемы захавання, вывучэння, успрымання: зборнік навуковых прац удзельнікаў VII Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі (Мінск, 26– 28 красавіка 2013 г.) / БДУКМ; рэдкал.: Языковіч В.Р. (адк. рэд. [і інш.]. – Мінск: БДУКМ, 2013. – С. 237– 239.
17. Мангушаў, І.А. Праблемы рэканструкцыі, вырабу і ўкаранення ў сучасную музычную культуру старажытных фальклорных духавых інструментаў беларусаў // "Этнашкола» ў сучасным адукацыйным працэсе: вопыт


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

станаўлення і перспектывы развіцця (да 10-годдзя існавання) / Уклад. і навук. рэдакт. праф. І.І.Сучкоў. – Минск: Бестпринт, 2004. – С- 220 – 229.
18. Народные музыкальные инструменты и инструментальная музыка: сб. статей и материалов в двух частях.– М.: Сов. композитор, 1987. – Часть первая. – 264 с., ил.
19. Народные музыкальные инструменты и инструментальная музыка: сб. статей и материалов в двух частях.– М.: Сов. композитор, 1987. – Часть вторая. – 327 с., ил.
20. Трамбіцкая, В.І. Фарміраванне інтарэсу да беларускага фальклору як умова актывізацыі дзейнасці дзіцячага аркестра народных інструментаў / В.І. Трамбіцкая // Зборнік тэзісаў дакладаў на навукова-метадычнай канферэнцыі прафесарска-выкладчыцкага складу: у 2 ч. / Мінск. ін-т культуры. – Мінск: Мінск. ін-т культуры, 1993. – Ч. II. – С. 43–45.
21. Трамбицкая, В.И. Формирование репертуара детских народно-инструментальных коллективов фольклорного направления / В.И. Трамбицкая // Вопросы теории и практики культурно-просветительной работы: тезисы докладов на конференции профессорско-преподавательского состава, Минский ин-т культуры. – Минск: МИК, 1991. С. 35–37.
22. Moszynski, K. Polesie Wscodnie. Materijaly etnograficzhne z wscodniego czessci b. Powiatu Mozyrskiego oraz z powiatu Rzeczyckiego. – Warzawa, 1928. – 304 s.
23. Pietkiewicz, Cz. Polesie Rzecsyckie. Cz. 2. Kultura duchowa Polesia Rzeczyckiego: Materijaly etnograficzhne. – Warzawa, 1938. – 459 s.

*Татьяна Бабич*

## МЕНТАЛЬНЫЕ ОСНОВАНИЯ ИЗУЧЕНИЯ И СОХРАНЕНИЯ ТРАДИЦИОННОГО МУЗЫКАЛЬНОГО ИНСТРУМЕНТАРИЯ И НАРОДНОЙ ИНСТРУМЕНТАЛЬНОЙ МУЗЫКИ БЕЛОРУСОВ

*Традиционные инструменты позволяют разносторонне показать жизнь и выразить своими музыкальными средствами особенности духовного склада народа, отразить его менталитет, мышление и мировоззрение. В данной статье актуализируется проблема сохранения традиционных музыкальных инструментов и народной инструментальной музыки белорусов.*

*Tatyana Babich*

## MENTAL FOUNDATIONS FOR STUDYING AND PRESERVATION OF TRADITIONAL MUSICAL INSTRUMENTS AND FOLK INSTRUMENTAL MUSIC OF THE BELARUSIANS

*Traditional instruments allow showing life from different angles and express with their musical means special features of people's spirituality, reflect its mentality, mind and worldview. This article actualizes the problem of preservation of traditional musical instruments and folk instrumental music of the Belarusians.*

Традиционные музыкальные инструменты играют важную роль в духовной жизни белорусского народа, отражая его менталитет, мировоззрение и национальную культуру. Менталитет белорусской нации отличает ее от других народов. Менталитет (от фр.mentalite – мышление, мыслительное содержание) – понятие, объединяющее многообразие смыслов и значений. В контексте данной работы менталитет ассоциируется с проблемой национально своеобразия культуры. На самом деле понятие «менталитет» шире и объемнее, нежели национальное своеобразие. На всем протяжении становления и развития той или иной нации, ее духовной общности, менталитет понимается как ценностно-смысловое единство, которое включает жизненные установки, принципы, модели поведения, эмоции и настроения. Ценностно-смысловое единство нации опирается на глубинные зоны смысла, которые присущи данному обществу, его социальному наследию и культурной традиции. Существующий веками менталитет нации представляет духовное основание жизни народа, несет в себе энергию и жизненную силу той или иной культуры, целой цивилизации; его распад приводит к серьезному и глубокому кризису, а в конечном счете, и к краху, национальной катастрофе, гибели цивилизации. Традиции имеют первостепенное значение для национальной культуры и ее истории.

Традиционная инструментальная музыка Беларуси функционирует в системе устной коммуникации, что существенно отражается и в самом арсенале инструментария, его конструкции, формах исполнения и функционирования. В настоящее время все больше отечественных исследователей обращается к теме народного инструментария и народного исполнительства, в том числе белорусской этнической инструментальной культуры (И. Назина, Н. Яконюк, Г. Мишуров, Н. Мицуль, В. Калацей, А. Сурба и др.). В центре внимания исследователей – инструментарий и формы его бытования,особенности функционирования в различных жанрах и сферах деятельности носителей этнических традиций.

Актуальность современного изучения белорусской традиционной музыкальной культуры обусловлена рядом факторов: 1) уникальностью и сохранением в музыкальной этнической культуре традиционного функционирования музыкального искусства в быту и обрядах; 2) реальным функционированием в современной



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ